УДК 94 (476)

## ПРАБЛЕМА САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ ДВАРАН МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1862–1863 гг.

***Д.У. Лішай***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр.Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*

Разглядаюцца асаблівасці самаідэнтыфікацыі дваран Мінскай губерні. У якасці прыкладу аналізуюцца рэзанансныя выпадкі выказвання прывілеяваным саслоўем уласнай пазіцыі па прынцыповых пытаннях развіцця рэгіёна. Акцэнтуецца ўвага на падачы мясцовымі элітамі палітычных адрасоў у 1862–1863 гг.

***Ключавыя словы:*** *самаідэнтыфікацыя; дваране; губерня; адрас.*

## ПРОБЛЕМА САМОИДЕНТИФИКАЦИИ ДВОРЯН МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ В 1862–1863 гг.

***Д.В. Лишай***

*Белорусский государственный университет, пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*

Рассматриваются особенности самоидентификации дворян Минской губернии. В качестве примера анализируются резонансные случаи высказывания привилегированным сословием собственной позиции по принципиальным вопросам развития региона. Акцентируется внимание на подаче местными элитами политических адресов в 1862–1863 гг.

***Ключевые слова:*** *самоидентификация; дворяне; губерния; адрес.*

## THE PROBLEM OF SELF-IDENTIFICATION OF THE NOBLES OF THE MINSK PROVINCE IN 1862–1863

***D.U. Lishai***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, lishaiy-d96@yandex.ru*

The article examines the features of self-identification of the nobility of the Minsk province. As an example, the notable cases of expressing by a privileged social estate of its position on fundamental issues of regional development are analyzed. Attention is focused on the submission of political addresses by local elites in 1862–1863.

***Key words:*** *Self-identification; nobles; province; address.*

Самаідэнтыфікацыя насельніцтва, яго нацыянальная свядомасць, этнічная прыналежнасць заўсёды выклікалі вострыя навуковыя дыскусіі. Для айчыннай гістарыяграфіі пытанне нацыятворчага працэсу надзвычай актуальнае. Аднак разуменне яго вытокаў у даследчыкаў супярэчлівае. У гэтай сітуацыі варта звярнуць увагу на своеасаблівыя зрухі ў самаідэнтыфікацыі дваран Мінскай губерні. Яскравым прыкладам апошняга стала падача палітычных адрасоў у 1862–1863 гг. Узгаданыя падзеі адбываліся ва ўмовах сапраўднай ідэалагічнай барацьбы расійскага ўрада з польскім уплывам на беларускіх землях. Нягледзячы на лаяльнасць з боку асобнай часткі дваранства, улады бачылі ў мясцовых элітах варожы элемент.

Разнастайныя аспекты тэмы вывучаліся беларускімі і замежнымі аўтарамі. Праблема самаідэнтыфікацыі прывілеяванага саслоўя ў сярэдзіне XIX ст. закранался ў даследаваннях А.Ф. Смірнова [14], С.М. Токця [15], А. Латышонка [3], А.Ф. Смалянчука [13], В.С. Макарэвіча [4-5], Д. Сталюнаса [18], Р. Радзіка [12], А.І. Мілера [7]. Пры гэтым тэма самаідэнтыфікацыя дваран беларускіх зямель патрабуе далейшага вывучэння.

База крыніц уключае адрас мясцовага дваранства на імя імператара Аляксандра II з фонда 320 «Канцылярыя мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) [10], а таксама матэрыялы справаздач расійскіх чыноўнікаў, зборнік якіх падрыхтаваў А.І. Мілавідаў [1]. Асабістае стаўленне да падзей выказалі ў сваіх успамінах сакратар віленскага генерал-губернатара А.М. Масолаў [6], расійскі генерал-фельдмаршал Д.А. Мілюцін [8], прадстаўнік паўстанцкага кіраўніцтва Я. Гейштар [17], грамадскі дзеяч Э. Вайніловіч [2], архіепіскап Мінскі і Бабруйскі М. Галубовіч [16], паручнік лейб-гвардыі М.К. Палявы [11]. Даведачны апарат прадстаўлены біяграфічнымі звесткамі з крыніц НГАБ, апрацаваных Ю.М. Снапкоўскім [9].

Падчас выбараў у Мінскі губернскі дваранскі дэпутацкі сход у лістападзе 1862 г. назіралася напружаная сітуацыя. Мясцовыя эліты рыхтавалі адрас на імя імператара Аляксандра II, у якім прадугледжвалася магчымасць далучэнне губерні да Царства Польскага [1, с. 437], [8, с. 405]. Падобныя прашэнні складалі і ў іншых заходніх губернях, што было звязана з ідэяй стварэння пэўнай аўтаноміі для тэрыторый былой Рэчы Паспалітай [14, с. 78]. Але рэакцыя расійскіх улад на гэтыя прэтэнзіі была імгненная. Элітам Мінскай губерні забаранялася падача адраса. На думку віленскага генерал-губернатара У.І. Назімава, падрыхтоўка дакумента мела сувязь з дзейнасцю польскай эміграцыі ў Парыжы [1, с. 434].

Нягледзячы на выкананне ўсіх патрабаванняў улад, дваране Мінскай губерні зрабілі яшчэ адзін крок, які выконваючы абавязкі грамадзянскага губернатара А.Л. Кажэўнікаў вызначыў як злачынны. Эліты рэгіёна склалі пратакол, дзе пазначылі не толькі сваё жаданне падаць адрас з патрабаваннямі да імператара Аляксандра II, а і зафіксавалі тыя акалічнасці, якія перашкодзілі ім ажыццявіць гэты намер [1, с. 437]. Дакумент падпісалі 255 асоб [9, с. 159]. За такую пазіцыю Мінскі губернскі дваранскі дэпутацкі сход трапіў пад рэпрэсіі з боку ўлад. Выконваючы абавязкі грамадзянскага губернатара А.Л. Кажэўнікаў загадаў адмяніць выбары і распусціць дэлегатаў [1, с. 437]. Не пазбегнуў пакарання і прадвадзіцель дваранства (маршалак) А.Д. Лапа. За дэманстрацыю ўзгаданай вышэй апазіцыі ён будзе высланы ў г. Кунгар Пермскай губерні [9, с. 159].

Разам з тым акцыя па падрыхтоўцы адраса выклікала нязгоду ў часткі прывілеяванага саслоўя Мінскай губерні. Як адзначае гісторык А.Ф. Смірноў, з'явіліся дзве групы, што адмовіліся падпісаць пратакол сходу [14, с. 79]. Гэта сведчыць пра наяўнасць ідэйнага расколу ў дваранскім асяроддзі рэгіёна.

На фоне ўзрастаючага нацыянальнага пытання ў Еўропе, апагеям якога стаў італьянскі вызваленчы рух, барацьба эліт польскіх і беларускіх зямель за ідэі незалежнасці набірала моц. Асновай для іх заставалася памяць пра часы Рэчы Паспалітай. Гэта характарыстыка часта выкарыстоўваецца для вызначэння свядомасці мясцовага дваранства як выключна польскай. Але на момант паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Мінскай губерні адбылася яшчэ адна падзея, якая прымушае паглядзець на самаідэнтыфікацыю прывілеяванага саслоўя не так адназначна.

Восенню 1863 г., калі ўзброенае выступленне ў рэгіёне было амаль падаўлена, мясцовыя эліты мусілі скласці «вернападданіцкі» адрас на імя імператара Аляксандра II, каб пацвердзіць сваю прыхільнасць да існуючага палітычнага рэжыму. Ад Мінскай губерні адрас падпісалі 2744 асобы [17, s. 72]. Кіраваў гэтай акцыяй новы прадвадзіцель дваранства рэгіёна Я.С. Прушынскі. Лаяльнасць маршалка, як адзначае гісторык С.М. Токць, дапамагла яму заручыцца падтрымкай з боку афіцыйнага кіраўніцтва [15, с. 125–126]. Грамадскі дзеяч Э. Вайніловіч падкрэсліваў, што Я.С. Прушынскі стаў першым кіраўніком дваранства ў рэгіёне, які быў не выбраны прадстаўнікамі прывілеяванага саслоўя, а прызначаны ўладамі [2, с. 80]. Аднак варта ўлічыць важную інфармацыю, што прыводзіцца ва ўспамінах сакратара віленскага генерал-губернатара А.М. Масолава наконт пазіцыі Я.С. Прушынскага: «Решаясь на составление адреса, он написал окружное послание на белорусском языке с выражением своих убеждений. Он высказывал в нем уверенность в исторической необходимости слияния западных губерний с Россией, но в то же время необходимость этого слияния он доказывал мыслью о панславизме. Мысль эта пустила было корни в Минской губернии, так как в ней заключалась известная уловка поляков, которые на все согласны лишь бы не быть и не называться русскими» [6, с. 585].

Вызначыць ступень самаідэнтыфікацыі на прыкладзе гэтага ўчынку дастаткова складана. Істотным недахопам з'яўляецца той факт, што патрэбны матэрыял у крыніцах пакуль не выяўлены [10, арк. 1–1 адв.]. Калі закранаць тэарэтычны аспект праблемы, то таксама назіраецца неадназначая сітуацыя. Так, польскі сацыёлаг Р. Радзік сцвярджае, што на фарміраванне беларускай нацыі большы ўплыў аказала культурнае дамінаванне традыцый сялянства, а не дваранскіх эліт [12, с. 202]. Аднак важна ўлічваць і свядомасць прывілеяванага саслоўя. Бо, моўны аспект, як адзначае расійскі гісторык А.І. Мілер, стаў важным інструментам палітычнай барацьбы за падуладныя тэрыторыі ў Расійскай імперыі [7, с. 67]. На думку В.С. Макарэвіча і С.М. Токця, ужыванне беларускай мовы прадстаўнікамі прывілеяванага саслоўя мела непасрэдную сувязь з тагачаснымі палітычнымі абставінамі [4, с. 270–271; 5, с. 34; 15, с. 124].

Каб зразумець сутнасць пазіцыі Я.С. Прушынскага, неабходна звярнуцца да асобы губернскага маршалка. Займаючы пасаду прадвадзіцеля дваранства Мінскай губерні ў

1863–1877 гг., ён даслужыўся да чына сапраўднага стацкага саветніка. Вядома, што яшчэ ў 1820-я гг. маршалак меў дачыненне да адной з масонскіх лож г. Мінска [9, с. 200–201]. Відавочна, што прадвадзіцель дваранства Мінскай губерні канчаткова не стаў прыхільнікам палітыкі расійскіх улад. Архіепіскап Мінскі і Бабруйскі М. Галубовіч успамінаў, як яшчэ ў кастрычніку 1860 г. Я.С. Прушынскі выказаў думку, згодна з якой Расійскую імперыю чакаў распад [16, s. 122]. Паводле слоў паручніка лейб-гвардыі М.К. Палявога, якому давялося працаваць у 1864–1865 гг. міравым пасрэднікам у Бабруйскім павеце, Я.С. Прушынскі выкарыстоўваў сваю пасаду для антыўрадавых спраў: «Как чиновник, назначенный Муравьевым, он не мог, не смел выступать явно со всеми своими польскими убеждениями и стремлениями; но в душе был точно таким же повстанцем, как Лаппа, сидевший уже где-то в крепости» [11, с. 250].

Вядома, што пасля паўстання 1863–1864 гг. Я.С. Прушынскі прымаў удзел у распрацоўцы амбіцыйнага рэлігійнага праекта. Паводле яго прадугледжвалася аб’яднанне каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы на тэрыторыі Расійскай імперыі [13, с. 72], [18, s. 183–185]. Гэта выклікала негатыўнае стаўленне мясцовых эліт да прадвадзіцеля дваранства Мінскай губерні. Аднак, як адзначае А. Латышонак, такі праект мог значна паўплываць на развіццё беларускага грамадства [3, с. 464, 524].

Такім чынам, тэма самаідэнтыфікацыі дваран Мінскай губерні ў 1862–1863 гг. застаецца дыскусійнай. Варта падкрэсліць складаны шлях вызначэння прывілеяваным саслоўем сваёй прыналежнасці. У гэтым можа бачыцца як спецыфіка палітычных поглядаў, так і прагматычны разлік мясцовых эліт у адпаведнай сітуацыі. Апошнія заўвагі трапна ілюструе праца Я.С. Прушынскага на пасадзе губернскага прадвадзіцеля дваранства. Несумненным застаецца тое, што асаблівасці падрыхтоўкі палітычных адрасоў у 1862–1863 гг. сведчаць пра актывізацыю працэсаў самаідэнтыфікацыі, якія папярэднічалі магутным зрухам у нацыянальнай свядомасці грамадства.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Виленский временник / основатель и редактор А.Н. Харузин. Кн. 6: Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию в пределах Северо-Западного края: в 2 ч. / сост. А.И. Миловидов. Вильна : Губернская типография, 1913–1915. Ч. 1: Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 года по май 1863 г. / сост. А.И. Миловидов. Вильна: Губернская типография, 1913.
2. Война́лович, Э. Воспоминания: [перевод с польского]. Минск: Минская римо-католическая парафия св. Симона и Елены, 2007.
3. Латышонак, А. Нацыянальнасць – Беларус. Смаленск: Інбелкульт, 2017.
4. Макарэвіч, В. С. Развітанне з сарматызмам – нацыянальны склад і мова шляхты Беларусі ў XIX ст. // Шлях да ўзаемнасці: матэрыялы XII міжнар. навук. канф., Гродна, 11–12 лістапада 2004 г. / Гродзенскі дзярж. ун-т; пад рэд.: С.Мусіенкі, П.Скрабко. Гродна, 2006. С. 268–273.
5. Макарэвіч В. Эвалюцыя форм нацыянальнай ідэнтычнасці шляхты Беларусі ў XVI–XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 2007. №1. С. 30–35.
6. Мосолов, А. Н. Виленские очерки 1863–1865 гг. Муравьевское время // Русская старина. 1883. Т. 40. С. 573–628.
7. Миллер, А. И. Империя Романовых и национализм: Эссе по методологии исторического исследования. М. : Новое литературное обозрение, 2006.
8. Милютин, Д. А. Воспоминания генерал-фельдмаршала графа Дмитрия Алексеевича Милютина, 1860–1862. М. : Студия «ТРИТЭ» Н. Михалкова: Российский Архив, 1999.
9. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю.Н. Снапковский; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. Минск. : Беларусь, 2016.
10. НГАБ. Ф. 320. Воп. 1. Спр. 397.
11. Полевой, Н. К. Два года, – 1864 и 1865, из истории крестьянского дела в Минской губ. II. Минская губерния в 1864 году // Русская старина. 1910. Кн. II. С. 247–270.
12. Радзік, Р. Вытокі сучаснай беларускасці. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст.: пераклад з польскай. Мінск : Медысонт, 2012.
13. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917 г. Санкт-Пецярбург : Неўскі прасцяг, 2004.
14. Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. М. : АН СССР, 1963.
15. Токть, С. М. Белорусы в эпоху формирования модерных европейских наций (XIX – начало XX в.) // Белорусы: нация Пограничья / А.К. Кравцевич, А.Ф. Смоленчук, С.М. Токть. Вильнюс : ЕГУ, 2011. Гл. 2. С. 85–158.

16. Янушкевіч, Я. Я. Дыярыюш з XIX стагоддзя: Дзённікі М. Галубовіча, як гіст. крыніца: Да 200-годдзя з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884). Мінск : Хурсік, 2003.
17. Gieysztor, J. Pamiętniki Jakóba Gieysztora z lat 1857–1865: w 2 t. Wilno : Nakladem Tow. Udz. «Kurier Litewski», 1913. T. 2.
18. Staliūnas, D. Making Russians: meaning and practice of Russification in Lithuania and Belarus after 1863. Amsterdam : New York : Rodopi, 2007.

УДК 94(476):352 “18”

# КЛЮЧЕВЫЕ АСПЕКТЫ ФОРМИРОВАНИЯ ОРГАНОВ ГОРОДСКОГО САМОУПРАВЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ ПОД ВЛАСТЬЮ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

***С. Л. Луговцова***
*Исторический факультет БГУ, ул Красноармейская 6, 220030, г. Минск, Беларусь, sv.lougovtsova@gmail.com*

В статье рассматривается формирование органов городского самоуправления на территории белорусских губерний Российской империи на основании законодательных актов XVIII–XIX веков, которые определили формы организации и роль местных жителей в системе самоуправления. Выясняются причины, которые обусловили значительную специфику системы городского управления на территории современной Беларуси, обусловили высокий удельный вес дворянского сословия в его структуре.
***Ключевыя слова:*** *города; белорусские губернии; Российская империя; органы самоуправления; законодательные акты.*

# КЛЮЧАВЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМАВАННЯ ОРГАНАЎ ГАРАДСКОГА САМАКІРАВАННЯ БЕЛАРУСІ ПАД УЛАДАЙ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

***С. Л. Лугаўцова***
*Гістарычны факультэт БДУ, вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск, Беларусь, sv.lougovtsova@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца фарміраванне органаў гарадскога самакіравання на тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі на падставе заканадаўчых актаў XVIII–XIX стагоддзяў, якія вызначылі формы арганізацыі і рол мясцовых жыхароў у сістэме самакіравання. Высвятляюцца прычыны, якія абумовілі значную спецыфіку сістэмы гарадскога кіравання на тэрыторыі сучаснай Беларусі, абумовіла высокую ўдзельную вагу дваранскага саслоўя ў яго структуры.
***Ключавыя словы:*** *гарады; беларускія губерні; Расійская імперыя; органы самакіравання; заканадаўчыя акты.*

# THE KEY ASPECTS OF THE FORMATION OF BELARUSIAN CITIES SELF-GOVERNMENT BODIES UNDER THE AUTHORITY OF THE RUSSIAN EMPIRE

***Sv. Lougovtsova***
*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, sv.lougovtsova@gmail.com*

The article deals the formation of municipal governments at the territory of the Belarusian provinces of the Russian Empire on the basis of legislative acts of the 18th–19th centuries. These acts determined the forms of organization and the role of local residents in the system of self-government. The author finds out the reasons that caused a significant specificity of the city government system at the territory of modern Belarus and determined the high proportion of the nobility in its structure.
***Key words:*** *cities; Belarusian provinces; the Russian Empire; self-government bodies; legislative acts.*

В результате трех разделов Речи Посполитой территория современной Беларуси вошла в состав Российской империи. На территории белорусских губерний (под «белорусскими» автор понимает Виленскую, Гродненскую, Минскую, Витебскую и Могилевскую губернии) постепенно реализовывались положения «Грамоты на права и выгоды городам Российской империи», изданной 21 апреля 1785 г. Екатериной II. Грамота позволяла жителям городов составлять «градское общество», получавшее право юридического лица. Ему разрешалось заводить собственность, иметь доходы, собирать специальные сборы, избирать органы городского управления. По грамоте все население города делилось на 6 разрядов – сословных групп: